РЭАЛЬНЫЯ КРОКІ ДАЮЦЦА НЕ ПРОСТА...

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС».)

Вось, напрыклад, ідзе размова пра малыя гарады як месцы, найбольш прыдатныя для «зялёнай» эканомікі. Нагадаю, што да гэтай катэгорыі пасяленняў звычайна адносяцца тыя, дзе пражывае да 50 тысяч чалавек. Урбаністы адносяць да ліку такіх населеных пунктаў пасяленні з колькасцю жыхароў да 20 тысяч чалавек. Будзем зыходзіць з першай лічбы.

Беларусь, як вядома, краіна малых гарадоў. З больш чым 200 гарадскіх пасяленняў (у Беларусі гэта гарады, гарадскія, рабочыя і адзін курортны пасёлак) амаль 90 % складаюць малыя, а пражывае ў іх усяго каля 20 % гарадскога насельніцтва. Тым не менш менавіта яны застаюцца крыніцамі самабытнасці беларускага народа, яго нацыянальнай культуры, традыцый і захаванага прыроднага асяроддзя.

> Неаднойчы звярталіся да мясцовых улад на прамую лінію з просьбай пачысціць раку хоць у межах пасёлка. У адказ чулі абяцанні, спасылкі на неабходнасць распрацоўкі праекта і ўключэння яго ў план будучых работ.

Праблема большасці малых гарадоў і асабліва гарадскіх пасёлкаў – наяўнасць, як правіла, аднаго горадаўтваральнага прадпрыемства, ад фінансавага стану якога ў значнай ступені залежыць іх развіццё. Ды і гэтыя прадпрыемствы ў апошнія гады, бывае, прыпыняюць сваю дзейнасць (спадчына СССР), а прыватны бізнес не набыў патрэбных маштабаў. Распрацаваныя ў рамках супрацоўніцтва з праектам ПраААН «Устойлівае развіццё на мясцовым узроўні» стратэгіі у такіх гарадах, як Тураў і Фаніпаль, сітуацыю ў цэлым не ратуюць. Адсюль – праблема адносна высокага ўзроўню беспрацоўя і як вынік – не надта высокага ўзроўню жыцця.

Яшчэ больш ускладняюць перспектывы далейшага развіцця малых гарадоў сучасныя дэмаграфічныя працэсы: вельмі нізкі натуральны прырост (у больш чым палове з іх ён увогуле адсутнічае), старэнне насельніцтва (ва ўзросце, старэйшым за працаздольны, знаходзіцца, як правіла, не менш чвэрці жыхароў), міграцыйны адток у вялікія гарады і іншыя.

Як бачым, у значнай колькасці малых гарадоў магчымасці развіцця прыватнага сектара вельмі абмежаваныя. Больш за тое, нават пры сур'ёзнай дзяржаўнай падтрымцы патэнцыял шматлікіх малых гарадоў не дазваляе ў сучасных умовах разгарнуць канкурэнтаздольную вытворчасць, не кажучы ўжо пра яе «зялёнае» аблічча.

Нельга не ўлічваць і тое, што малыя гарады вельмі розныя і патрабуюць у сваім развіцці дыферэнцыраванага падыходу. Аднак цяжка зразумець такую дыферэнцыяцыю, калі, напрыклад, той самы Навагрудак стаў пілотным горадам праекта «Зялёныя гарады», але ж у спіс пілотных раёнаў, на тэрыторыі якіх рэалізуецца праект «Падтрымка эканамічнага развіцця на мясцовым узроўні ў Рэспубліцы Беларусь», не ўвайшоў. Разам з тым у Мінскай вобласці да такіх пілотных раёнаў аднесены блізкія па сваім патэнцыяле Маладзечанскі і Барысаўскі раёны.

Найважнейшае эканамічнае патрабаванне пры размяшчэнні вытворчасці – агламерацыйны эфект, бо кампактна размешчаныя аб'екты, калі яны спалучаюцца, заўсёды больш эфектыўныя, чым размешчаныя ізалявана. На жаль, такім эфектам валодаюць толькі сталіца і некалькі буйных гарадоў краіны.

Увогуле, трэба вельмі адказна падыходзіць да ўкладання інвестыцый, асабліва да выбару месцаў для размяшчэння тых ці іншых аб'ектаў. Падзеі, звязаныя з будаўніцтвам акумулятарнага завода пад Брэстам, вытворчасцю цэлюлозы ў Светлагорску і іншыя толькі пацвярджаюць гэты тэзіс. І хоць названыя гарады не адносяцца да малых, перакананы: праблема размяшчэння прадпрыемстваў, нават і менш экалагічна небяспечных, актуальная і ў іх межах. Мяркую, што ва ўмовах, калі вывучэнне эканамічнай геаграфіі Беларусі будзе завяршацца ў дзявятым класе агульнаадукацыйных школ (так прадугледжана новым планам), памылак пазбегнуць не атрымаецца.

А вось яшчэ адзін прыклад з маіх родных Смілавіч. Рэальная колькасць усіх занятых у прыватным бізнесе сёння ў гэтым пасёлку ў разы саступае колькасці некалі занятых на адным гарбарным заводзе, якога ўжо няма. Заўважце, размова ідзе пра аб'ект, які амаль поўнасцю абапіраўся на ўласную сыравіну і ў 70-я гады XX ст. правёў рэканструкцыю. Па сутнасці, тады было створана новае прадпрыемства. Але ўжо каля дзесяці гадоў на яго месцы стаіць адзін каркас, і толькі сёлета пачалося «лёгкае варушэнне». Трэба было ўсё разбурыць, каб потым стварыць сумесны турэцка-беларускі бізнес па вытворчасці медыцынскіх прэпаратаў, які ў найлепшым выпадку дадаў некаторую колькасць рабочых месцаў.

Адмыслова не закранаю экалагічны аспект былога і ствараемага на яго месцы прадпрыемстваў у Смілавічах. Заўважу толькі, што гэта цэнтр пасёлка, а да ракі Волмы 50 метраў – да яе і пракладзена ліўневая каналізацыя. Пагадзіцеся, што тут цяжка будзе ўбачыць нешта ад «зялёнай» эканомікі.

А вось сама рака даўно чакае аздараўлення. Апошні раз яе чысцілі ў 50-я гады XX ст. Непасрэдна я сам і яшчэ некалькі нераўнадушных грамадзян неаднойчы звярталіся да мясцовых улад на прамую лінію з просьбай пачысціць раку хоць у межах пасёлка. У адказ чулі абяцанні, спасылкі на неабходнасць распрацоўкі праекта і ўключэння яго ў план будучых работ. Мы можам па-чакаць, але рака чакаць не можа, яна ўсё больш зарастае і гіне.

Літаральна на працягу мая – ліпеня ў Смілавічах распачата актыўнае добраўпарадкаванне цэнтральнай часткі ў выглядзе замены асфальту на брусчатку. Аднак у працэсе добраўпарадкавання было вырублена некалькі дрэў. А дзе ж у такім выпадку новыя пасадкі? Больш таго, каля крамы «Сямёрачка» пашырылі пляцоўку для паркоўкі машын, у сувязі з чым давялося таксама спілаваць некалькі дрэў... Вось такія «зялёныя» прыярытэты на лакальным узроўні.

> Розныя дзяржаўныя і рэгіянальная праграмы, уся адукацыйная сфера ў той ці іншай ступені ўтрымліваюць экалагічны складнік. Аднак патрабаваннем дня з'яўляюцца не тэарэтычныя палажэнні, а рэальныя крокі на гэтым шляху.

Мяркую, органам тэрытарыяльнага грамадскага самакіравання тут ёсць над чым падумаць і куды прыкласці намаганні. Глыбока перакананы ў тым, што сродкі, якія пайшлі на брусчатку ў вышэйзгаданым выпадку, былі б з большай карысцю выдаткаваны на вырашэнне іншых жыццёва важных праблем.

Спадзяюся, што ўзнятая тэма зацікавіць чытачоў газеты з малых гарадоў Беларусі і яны змогуць параўнаць напісанае з тым, што робіцца па прасоўванні «зялёнай» эканомікі на іх радзіме, і падзеляцца сваімі разважаннямі з газетай.

Вячаслаў САСНОЎСКІ,
кандыдат геаграфічных навук,
дацэнт.

И З В Е Щ Е Н И Е о проведении повторного открытого аукциона по продаже недвижимого имущества, принадлежащего ОАО «Торговое автопредприятие» 4 сентября 2019 года

№ лота	Предмет аукциона (наименование объекта, его местонахождение, площадь)	Начальная цена продажи предмета аукциона, бел. руб., к. (с учетом НДС)	Размер задатка, бел. руб., к.	Характеристика объекта	Условие аукциона
1	Благоустройство территории с инвентарным номером 700/С-106076, общей площадью 3 495,5 кв. м, расположенное по адресу: Могилевская обл., г. Могилев, ш. Славгородское, территория ш. Славгородское, 159	40 320 р. 00 к.	4 032 р. 00 к.	Благоустройство территории состоит из: асфальтобетонное покрытие площадью 2 678,3 кв. м, бордюр бетонный длиной 29,65 м; бетонное покрытие площадью 817,2 кв. м, бордюр бетонный длиной 153,25 м; ограждение металлическое длиной 22,5 м; ворота металлические.	Без условий

Начальная цена снижена на 50 %.
Аукцион состоится 4 сентября 2019 года в 15.00 в здании Могилевского городского исполнительного комитета по адресу: г. Могилев, ул. Первомайская, 28а.
Заявки принимаются ежедневно с 23 августа 2019 г. в рабочие дни с 8 до 17 часов (обеденный перерыв с 13.00 до 14.00) по адресу: г. Могилев, ул. Первомайская, 28а, каб. 407.
Последний день приема заявлений и внесения задатка – 3 сентября 2019 года до 17.00. Заявления, поступившие после указанного срока, не рассматриваются.
Заключительная регистрация участников аукциона 4 сентября 2019 года с 14.00 до 15.00.

Продавец: ОАО «Торговое автопредприятие», 212030, г. Могилев, Славгородское шоссе, 159, контактные телефоны – (80222) 46-70-82, 8-044-727-30-44 (вел.).
Организатор аукциона – МГ УКП «Центр по приватизации», 212030, г. Могилев, ул. Первомайская, 28а, контактные телефоны – (80222) 42-25-64, 42-24-59, 8-029-15-15-444.
Аукцион проводится в соответствии с порядком проведения открытого аукциона по продаже недвижимого имущества, принадлежащего ОАО «Торговое автопредприятие».
Недвижимое имущество расположено на земельном участке с кадастровым номером 740100000007005014, площадью 1,0236 га, назначение – земельный участок для обслуживания зданий и сооружений.
Лица, желающие принять участие в аукционе, не позднее срока, указанного в извещении о проведении аукциона, подают заявление на участие в аукционе, подписанное с организатором аукциона соглашение о правах и обязанностях сторон, заявление об ознакомлении с объектом, к которым прилагаются:
- документ, подтверждающий внесение суммы задатка на расчетный банковский счет организатора аукциона - МГ УКП «Центр по приватизации» BY66BLBB30120700008710001001 Дирекция ОАО «Белинвестбанк» по Могилевской области, код BLBBBY2X, УНН 700008710 с отметкой банка;
- юридическим лицом или индивидуальным предпринимателем Республики Беларусь – копия документа, подтверждающего государственную регистрацию этого юридического лица или индивидуального предпринимателя, без нотариального засвидетельствования;
- иностранным юридическим лицом – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписку из торгового реестра страны учреждения (выписка должна быть произведена не ранее 6 месяцев до подачи заявления на участие в торгах) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны учреждения с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык;
- иностранным индивидуальным предпринимателем – легализованный в установленном порядке документ, подтверждающий статус, с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык;
- представителем юридического лица Республики Беларусь – доверенность, выданная в установленным законодательством порядке (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель);
- представителем гражданина или индивидуального предпринимателя Республики Беларусь – нотариально удостоверенная доверенность:
- представителем иностранного юридического лица, иностранного физического лица или индивидуального предпринимателя – доверенность, легализованная в установленном законодательством порядке, с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык.
При подаче документов заявитель (его представитель) предъявляет документ, удостоверяющий личность, а руководитель юридического лица – также документ, подтверждающий его полномочия (приказ о назначении на должность руководителя, или заверенная выписка из решения общего собрания, правления либо иного органа управления юридического лица в соответствии с учредительными документами, или трудовой договор (контракт), или соответствующий гражданско-правовой договор, или иные документы в соответствии с законодательством).
Победитель аукциона (единственный участник аукциона) в течение 3 рабочих дней со дня проведения аукциона обязан в установленном порядке возместить организатору аукциона затраты на его организацию и проведение.
Договор купли-продажи заключается продавцом и победителем аукциона (единственным участником аукциона) в течение 10 рабочих дней со дня проведения аукциона и подписания протокола о результатах аукциона.
Условия и порядок оплаты – оплата стоимости приобретенного на аукционе предмета аукциона производится в течение 10 банковских дней с момента заключения договора купли-продажи.
С объектом можно ознакомиться ежедневно в рабочие дни недели с 8 до 17 часов, предварительно согласовав время с продавцом.
В предусмотренных законодательством случаях уплачивается штраф организатору аукциона в течение одного месяца в размере 100 базовых величин: **победителем аукциона** – в случае, если он в установленный срок не подписал протокол о результатах аукциона, не возместил организатору аукциона сумму затрат на организацию и проведение аукциона, не подписал договор купли-продажи предмета аукциона; **лицом, приравненным к победителю аукциона,** – в случае его отказа (уклонения) от возмещения затрат на организацию и проведение аукциона и (или) подписания договора купли-продажи предмета аукциона; **участниками аукциона** – в случае их отказа объявить свою цену за предмет аукциона, в результате чего аукцион признан нерезультативным.
Полная информация о выставленном на аукцион объекте недвижимости опубликована в газете «Звязда» № 120 (28987) – 28 июня 2019 г.
Контактные телефоны организатора аукциона для уточнения и получения дополнительной информации: (80222) 42-25-64, 42-24-59, 8-029-15-15-444